Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
18 САКАВІКА 2017 г. СУБОТА № 52 (28416)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ**

**НА СУВЯЗІ — ЖОДЗІНА І «ЗВЯЗДА»**

Прамая лінія з выконваючым абавязкі старшыні Жодзінскага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргеем КОНАНАМ пройдзе сёння з 9.00 да 12.00. Звяртацца можна па тэлефоне (8-017-75) 79737. Гэта прамая лінія праводзіцца сумесна з рэдакцыяй «Звязды»: наш карэспандэнт на месцы будзе сачыць, якія праблемы турбуюць грамадзян.

**Тэлефануйце! Вас абавязкова пачуюць!**

# СТАЛІЧНАЕ СЭЛФІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



**У Мінску гуляла «Мяцеліца»**

СТАР. 9



**Шчасце не ў золаце?**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль ЛАПО, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:**

*«Беларусь і надалей будзе заставацца адным з надзейных гарантаў забеспячэння пагранічнай бяспекі на рэгіянальным узроўні, а таксама падтрымае любыя ініцыятывы развіцця міжнароднага пагранічнага супрацоўніцтва з улікам нацыянальных інтарэсаў. Мы ацэньваем незаконную міграцыю як небяспеку гібрыднага характару. Усе органы пагранічнай службы ажыццяўляюць процідзеянне нелегальнай міграцыі і іншым відам трансгранічнай супрацьпраўнай дзейнасці ў цесным супрацоўніцтве з пагранслужбамі сумежных дзяржаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.03.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,8909 ▼ |
| Еўра | 2,0356 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0702 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

## Свая справа

## ДЗЯЎЧЫНА МАРУ ЗДЗЕЙСНІЛА

**Як дызайнер Таццяна ўласны бізнес адкрыла**

**Дзяўчына з аграгарадка Путрышкі, што каля Гродна, з дзяцінства любіла прыбірацца. А каб дасягнуць гэтага, пачала сама сваё адзенне мадэляваць, а потым і шыць. Вырашыла, што абавязкова стане дызайнерам-мадэльерам.**

### Гэта будуць насіць...

Сваю гісторыю Таццяна Русіняк расказвае з агеньчыкам у вачах, хоць мінула ўжо паўгода з тае пары, як усё пачалося. Перш-наперш трэба сказаць, што на той момант Таццяна скончыла Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт і стала дыпламаваным дызайнерам. Да таго часу яна ўжо набыла нейкі багаж — яшчэ студэнткай са сваімі калекцыямі ўдзельнічала ў розных паказах, у тым ліку і на вядомым конкурсе «Млын моды».



Але з працаўладкаваннем не шанцавала. Работу шукала ў вялікіх гарадах — спачатку ў Мінску, затым — у Гродне. Аказалася, што попыт ёсць, але не на дызайнераў, а на швачак. Таццяна ж марыла сама канструяваць адзенне, мець уласную справу. Паўстала пытанне: як здзейсніць мару? Ідэю падказалі ў цэнтры занятасці. Маўляў, ваш кірунак уключаны ў пералік відаў дзейнасці, для якога можна атрымаць дзяржаўную субсідыю. Таццяна ўспамінае, што вельмі ўзрадавалася такой магчымасці.

СТАР. 7

## Спецыяльны рэпартаж

## «ТРЭБА ІСЦІ ДА КОЖНАГА»

**Карэспандэнт «Звязды» назірала, як у сельскай мясцовасці ўдакладняюцца спісы «ўтрыманцаў»**

**Прыёмы, сходы, кансультацыі, нават падамавы абход — усе метады добрыя, каб дайсці да кожнага чалавека і высветліць, што яму перашкаджае працаваць. Дзесьці сапраўды ёсць напружанне на рынку працы, але аграгарадок Вейна Магілёўскага раёна да такіх месцаў не адносіцца. Да Магілёва рукой падаць, побач свабодная эканамічная зона, дзе перыядычна адкрываюцца новыя прадпрыемствы. Тым не менш праблема існуе і тут. На шэсць тысяч насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыі сельсавета, 212 чалавек трапілі пад дзеянне дэкрэта №3.**

Цяпер спісы ўдакладняюцца, ідзе так званае больш глыбокае вывучэнне біяграфій кожнага з тых, хто ў іх трапіў. Работнікі сельвыканкама ўжо зрабілі падамавы абход непрацуючых, а там, дзе іх не засталі, апыталі суседзяў. На кожнага ў **старшыні Вяйнянскага сельвыканкама Святланы СЦІШАНКОВАЙ** ёсць невялічкае дасье — дзе чалавек працаваў раней, колькі гадоў стажу, з кім жыве, ці ёсць дзеці, сацыяльны статус.

— Большасць з тых людзей, якім належыць плаціць збор, злоўжываюць спіртным, — расказвае Святлана Сцішанкова. — Ёсць адзін шматдзетны бацька, які раней працаваў у ДРБУ, рабіў дарогі, людзі кажуць, што быў вельмі добры спецыяліст, але спіўся зусім. Раз у месяц выклікаю яго на саветы грамадскага правапарадку, у якіх прымаюць удзел і пракурор раёна, і начальнік РАУС, гутарым шчыра, але наш падшэфны нікога слухаць не хоча, цвердзіць адно: не працаваў і не буду. Адправілі на год у ЛПП на перавыхаванне, а праз тры месяцы нам яго вярнулі з дыягназам, што ён не можа не піць. Нарколагі рукамі разводзяць: маўляў, стан здароўя такі, што немагчыма яго лячыць. Чалавек яшчэ не на пенсіі, і што з ім рабіць, не ведаю. І такіх, як ён, не адзін.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,**

**5 разоў на тыдзень!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# З МЭТАЙ УДАСКАНАЛЕННЯ

**Учора кіраўнік дзяржавы правёў нараду па пытанні аптымізацыі колькасці работнікаў дзяржаўных органаў.**

— Адной з неабходных умоў для павышэння эфектыўнасці дзяржаўнай улады з'яўляецца пастаяннае ўдасканаленне кіраўніцкай сістэмы і яе механізмаў, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Тут мы павінны дабівацца рэзультатаў, безумоўна, не лічбай, а ўменнем. Не раздуваць бюракратычны апарат, а сістэмна фарміраваць кампактную структуру і эфектыўную мадэль кіравання.

Як заявіў Прэзідэнт, гэта трэба рабіць паступова і «гэта не разавы акт, прывязаны да нейкай канкрэтнай лічбы».

— Перш за ўсё нам трэба адсекчы ўсё лішняе ўмомант, што плодзіць бюракратыю і перашкаджае дынамічнаму развіццю краіны. Кожны чалавек, які працуе ў дзяржаўнай структуры, павінен мець перад сабой пэўную мэту і выконваць пэўныя задачы. Калі гэтыя людзі такім чынам загружаны, значыць, яны дадуць вынік, — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што аптымізацыя мае на ўвазе не толькі колькасць работнікаў дзяржорганаў, а ў цэлым функцыянаванне дзяржаўнай машыны:

— Гэта сведчыць пра тое, што няправільна пастуپаюць і разумеюць тыя, хто бачыць у аптымізацыі функцыянавання дзяржаўных органаў толькі скарачэнне колькасці. Калі мы пойдзем гэтым шляхам, мы вялікага эфекту не дасягнём. Трэба пагладзець на ўсе працэсы, якія адбываюцца ў дзяржаўных органах краіны. На гэта, дарэчы, звяртае ўвагу насельніцтва, калі мы праводзім сацыялагічныя апытанні. Сустракаючыся на нарадах з прадстаўнікамі сілавых структур, я ўжо казаў пра тое, што нам трэба аптымізаваць працэсы і мы зможам атрымаць ад гэтага нашмат большы эфект.

У 2013 годзе ў краіне ўжо прадпрымалі пэўныя крокі. Цяпер неабходна гэту працу працягнуць, удзяляючы, як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, больш увагі якасці ўсёй кіраўніцкай дзейнасці.

— Таму ўраду і Адміністрацыі Прэзідэнта было даручана праапрацаваць і ўнесці мне на разгляд сістэмныя прапановы. Галоўная мэта ў гэтай справе — пазбавіць дзяржаўныя органы дублюючых і неўласцівых функцый, тых функцый, якія дзяржаўныя органы ўвогуле не павінны выконваць, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — А самае галоўнае, дэбюракратызаваць працэс прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў.

Як адзначыў падчас нарады Прэзідэнт, ён хацеў бы ўсебакова абмеркаваць прадстаўленыя прапановы па аптымізацыі дзейнасці дзяржорганаў, каб пасля прыняць правільнае рашэнне.

— Бо за гэтым стаяць канкрэтныя людзі. Трэба прызнаць, што ў цэлым у дзяржаўных структурах працуюць самыя адукаваныя, вопытныя і падрыхтаваныя людзі, ад якіх залежыць функцыянаванне дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт і на тым, што як бы сёння ні скарачалася колькасць дзяржслужачых, дзяржорганы невялікіх гарадоў, раёнаў, сельскія і пасялковыя саветы скарачаць не трэба.

* * *

**Як заявіў журналістам прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы, неабходна ў максімальнай ступені аптымізаваць працэсы, звязаныя з дзяржкіраваннем, а таксама знізіць іх затратнасць, не змяншаючы, а нават павялічваючы якасць кіраўніцкіх рашэнняў.**

— Гэты працэс павінен ісці не як нейкая кампанія да пэўнай даты, а пастуральна, на працягу па меншай меры гэтага года. І няма гаворкі пра тое, што нават гады працэс будзе завершаны. Ён павінен ісці пастаянна, — упэўнены Андрэй Кабякоў.

Ён таксама паведаміў, што Прэзідэнт даручыў правесці гэту работу вельмі ўважліва і карэктна, каб ні ў якім разе не пакрыўдзіць людзей, не скараціць кагосьці несправядліва або недаацаніць нечую працу.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# У АСНОВЕ — ПАРТНЁРСТВА І... ЛІЧБЫ

## Прэзідэнт паставіў задачу аднавіць узровень гандлёва-эканамічных сувязяў з Казахстанам

**Учора кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Мажыліса Парламента Казахстана Нурланам Нігматуліным.**

Зараз Казахстан — адна з самых дынамічных краін рэгіёна і адна з самых развітых дзяржаў постсавецкай прасторы. Апошнім часам у гэтай краіне праводзяцца як эканамічныя, так і палітычныя рэформы — у канстытуцыю дзяржавы ўносяцца карэктывы і сферы адказнасці галін улады змяняюцца.

— Мы сапраўды вельмі сур'ёзна і ўважліва вывучаем ваш вопыт, — сказаў Аляксандр Лукашэнка на пачатку размовы з госцем. — Думаю, што для Казахстана гэта вельмі важныя крокі, якія вы прадпрымаеце ў імя, перш за ўсё, захавання стабільнасці і незалежнасці вашай дзяржавы. Вы імкнецеся ўсялякія рэформы, асабліва па дзяржаўным уладкаванні, змяненні канстытуцыі, абавязкова падмацоўваць канкрэтнымі эканамічнымі крокамі. Гэта вельмі важна. Гэта добры такі прыклад для іншых.

Кіраўнік краіны звярнуў увагу, што ў такіх сітуацыях важна ўлічваць меркаванне людзей, а менавіта так і адбываецца ў Казахстане.

Яшчэ адзін важны момант, які закрануў Прэзідэнт падчас сустрэчы: у цяперашні складаны час для ўсіх краін, у тым ліку і для Казахстана, гэтай дзяржаве ўдаецца захоўваць адзінства.

Прэзідэнт расказаў, што нядаўна ў яго адбылася размова з кіраўніком Казахстана. Калі ўсё будзе добра, то лідары дзяржаў змогуць сустрэцца падчас сёлетняга саміту Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, які будзе прымаць Казахстан. Таксама магчымая сустрэча кіраўнікоў дзяржаў на сусветнай выстаўцы ЭКСПА-2017 у Астане.

— Гэта знакавая падзея ў эканоміцы, планетарная падзея, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Я цалкам у тэме, як вы рыхтаваліся. Многія цяпер адмаўляюцца ад падобных мерапрыемстваў. Тое, што Казахстан узяў на сябе гэтую функцыю і паступова, акуратна з году ў год рыхтаваўся — гэта сапраўды падзея.

Узровень двухбаковага супрацоўніцтва, асабліва ў лічбавым выражэнні, засёды іграе прыярытэтную ролю ў міжнародных адносінах. На жаль, на працягу апошніх двух гадоў наш тавараабарот зніжаецца. У мінулым годзе ён знаходзіўся на ўзроўні 420 мільёнаў долараў. Па словах кіраўніка дзяржавы, візіт спікера Мажыліса Парламента Казахстана будзе садзейнічаць развіццю і паглыбленню двухбаковых адносін у тым ліку і ў эканамічнай, гандлёвай сферах:

— Працы шмат. Працаваць трэба. Мы заўсёды з Нурсултанам Абішавічам кажам пра тое, што як бы мы тут ні ўпіраліся, як бы ні стараліся, тавараабарот у нас і ў Еўразійскім эканамічным саюзе, і паміж дзвюма краінамі, на жаль, падае. І гэтыя болевыя кропкі трэба нават не вызначаць — яны вызначаныя, трэба па гэтых кірунках працаваць. Эканоміка — аснова і фундамент адносін паміж дзяржавамі. Калі няма гандлёва-эканамічных сувязяў — больш таго, яны рушацца, гэта нікуды не варта. Трэба прадпрымаць самыя сур'ёзныя намаганні для таго, каб іх аднавіць.

Цяпер у Казахстане функцыянуе восем сумесных зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі і абсталявання. У мінулым годзе ў казахстанскім горадзе Какшэтаў была запушчана першая чарга праекта па стварэнні Казахстанска-Беларускага індустрыяльна-тэхналагічнага парка сельскагаспадарчай і камунальнай тэхнікі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Пяскоў: ніякіх сцэнарыяў аб магчымасці інтэграцыі Данбаса ў РФ няма



Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дз. Пяскоў падкрэсліў, што Масква з трывогай назірае, як Украіна «свядома адрынае ад сябе вялізны рэгіён».

Расія не мае ніякіх гатовых сцэнарыяў інтэграцыі Данбаса ў свой склад, а гіпатэтычныя развагі на гэты конт проста немагчымыя, заявіў прэс-сакратар прэзідэнта РФ Дзмітрый Пяскоў.

«Менавіта таму мы з трывогай назіраем, як Украіна свядома адрынае ад сябе велізарны рэгіён (Данбас)», — растлумачыў прэс-сакратар. «Эвентуальныя развагі ў гэтым кантэксце не лічым магчымымі», — заявіў Пяскоў у адказ на просьбу сказаць, ці магчыма такое развіццё падзей у будучыні.

## Тэрэза Мэй: рэферэндум аб незалежнасці несправядлівы ў адносінах да шатландцаў

Правядзенне чарговага рэферэндуму аб незалежнасці Шатландыі «ў корані несправядлівае» ў адносінах да жыхароў гэтай часткі Злучанага Каралеўства. Такое меркаванне выказала ў аўтарскім артыкуле, апублікаваным у газеце The Times прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй. Яна раскрытыкавала пазіцыю кіруючай у Эдынбургу Шатландскай нацыянальнай партыі (ШНП), якая стала ініцыятарам новага плебісцыту.

«ШНП спрабуе прымусіць урад Вялікабрытаніі пагадзіцца з тым, што ў корані несправядліва ў адносінах да шатландскага народа. Яна (партыя шатландскіх нацыяналістаў) хоча папрасіць шатландцаў прыняць важнае рашэнне пры адсутнасці неабходнай інфармацыі. Яны не будуць ведаць, што будзе ўяўляць сабой новае партнёрства Вялікабрытаніі з ЕС і якая можа быць альтэрнатыва незалежнай Шатландыі. Гэта было б проста несумленна», — лічыць Тэрэза Мэй.

## Польшча не спяшаецца ў зону еўра

Віцэ-прэм'ер Польшчы Матэуш Маравецкі заявіў, што краіна не будзе ўводзіць еўра на працягу бліжэйшых 10 ці 20 гадоў. Пра гэта паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Bloomberg.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што ўвядзенне еўрапейскай валюты ў Польшчы будзе магчыма ў тым выпадку, калі паказчыкі польскай эканомікі будуць супастаўныя з аналагічнымі паказчыкамі развітых еўрапейскіх краін. На сённяшняй Польшчы не выгадна пазбаўляцца магчымасці эмітаваць доўг, устанаўліваць працэнтныя стаўкі і друкаваць свабодна канверсоўную валюту. Раней кіраўнік польскай партыі «Права і Справядлівасць» Яраслаў Качыньскі заяўляў, што ўвядзенне еўра «ператворыць Польшчу ў перыферыйную нацыю». Акрамя таго, далучэнне да зоны еўра прывядзе да зніжэння ўзроўню жыцця палякаў.

■ Бізнес-клімат

## АДНУ ПІШАМ — ДЗВЕ ВЫКРЭСЛІВАЕМ

### Праект указа Прэзідэнта аб скарачэнні адмінпрацэдур гатовы

**Пра гэта заявіў першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Васіль МАЦЮШЭЎСКІ.**

Як растлумачыў віцэ-прэм'ер, асноўная мэта ўказа — аптымізацыя і скарачэнне адміністрацыйных працэдур. Дакумент папярэдне атрымаў назву «Аб сістэмным скарачэнні колькасці адміністрацыйных працэдур», аднак у ім ідзе гаворка не толькі пра змяншэнне іх колькасці. «За апошні час рабочая група на чале з Ірынай Касцевіч (міністр працы і сацыяльнай абароны. — **«Звязда».**) прарабіла вельмі значную працу. Ужо ёсць прапановы па скарачэнні 21 працэдуры», — адзначыў Васіль Мацюшэўскі.

Ірына Касцевіч паведаміла, што за мінулы год і два першыя месяцы гэтага скарацілі 41 адміністрацыйную працэдуру, «але пры гэтым прыраслі новымі». Каб праца па скарачэнні колькасці адмінпрацэдур была сапраўды эфектыўнай, прапануецца ўвесці прынцып: адну ўводзіш — дзве адмяняюцца. Прынцыпова важным міністр назвала і стварэнне рэестра адміністрацыйных працэдур. Прапануецца таксама зрабіць сэрвіс, які акумулюе ўсю інфармацыю аб адміністрацыйных працэдурах: куды неабходна звяртацца для іх выканання, у якія тэрміны і г. д. Большасць адмінпрацэдур з рэестра перавядуць у электронны выгляд — да 2020 года іх колькасць павінна быць 75%.

# ЗАДАВОЛІЦЬ СПАЖЫЎЦА

## Як палепшыць умовы для прадпрымальнікаў



Фота БЕЛТА.

**Амаль тры тыдні мінула, як Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўвяло мараторый на праверкі. Галоўная мэта гэтага кроку — пазбегнуць дублюючых функцый з сумежнымі службамі-кантралёрамі. У такім рэжыме ведамства прапрацуе да выхаду ўказа Прэзідэнта па кантрольна-наглядной дзейнасці. Чакаецца, што наноў распрацаваныя падыходы прывядуць да адкрыцця новых прадпрыемстваў і прытоку інвестыцый, а таксама развіцця канкурэнцыі. Але гэта толькі першы крок да паляпшэння бізнес-клімату ў краіне. Якімі бачацца наступныя дзеянні? Пра гэта паразважаў Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.**

***— На ваш погляд, калі не праверкамі, то якім чынам варта рэгуляваць дзейнасць прадпрымальнікаў?***

— Праверкі — гэта самая прымітыўная частка працэсу рэгулявання працы прадпрымальнікаў. Актыўная праверачная дзейнасць кантрольных органаў — а іх у нас больш за 60 — стварае абстаноўку боязі і недаверу. Гэта ўплывае на дзелавы клімат, на настрой бізнесмена, якога такая атмасфера можа дэматываваць. Між іншым, вядзенне ўласнай справы — гэта творчасць, для якой таксама важныя камфортныя ўмовы. Увявіце, што музыканту перад канцэртам сапсуюць настрой. У яго будуць дрыжаць рукі. Як ён тады сыграе?

Дзейнасць прадпрымальніка пастаянна спалучаецца з рызыкай. Сусветная статыстыка паказвае, што ў першы год пасля адкрыцця 80% фірмаў прыходзяць да банкруцтва. Нават у Амерыцы! А там сістэма падтрымкі бізнесу наладжана даўно. Бізнесмены, як маладыя парасткі, што прабіваюцца скрозь асфальт, могуць трапіць у неспрыяльны клімат. Таму мы падтрымліваем рашэнне Прэзідэнта перагледзець заканадаўства, сістэму рэгулявання бізнесу.

Што датычыцца альтэрнатыўных сістэмы рэгуляцыіі, тут перш-наперш трэба гаварыць пра вынясенне папярэджанняў, а ўжо пасля пра выпісванне штрафу. Хоць у ідэале варта працаваць на апярэджанне: больш кансультаваць. Часцей за ўсё прадпрымальнік не робіць нічога крымінальнага. А за дробныя памылкі ці варта адразу ж караць рублём? Магчыма, у памылцы чалавека можа хавацца заканадаўчая хіба, калі яна неадназоразова сустракаецца.

Сёння ў маленькім прыдарожным кафэ, каб сасмажыць яечню, павінны быць тры асобныя халадзільнікі: для яек, для мяса і для агародніны. І дранікі робяць з бульбяной мукі, зробленай у Германіі ці Польшчы, а не з сырой беларускай бульбы, бо для гэтага трэба мець некалькі мыечных пакояў. Але калі ўсё выканаць, ці магчыма з такой кавярні атрымаць прыбытак? І якім будзе кошт страў? Пры нармальнай канкурэнцыі цэны рэгулюе спажывец. Бо ён — апора малога і сярэдняга бізнесу. Бізнес развіваецца толькі тады, калі ўлічаны інтарэсы спажыўцоў.

***— І ўсё ж зараз актыўна ўзяліся за вырашэнне набалелых пытанняў...***

— Калі казаць аб спрашчэнні, патанненні, скарачэнні тэрмінаў выкання адміністрацыйных працэдур, якіх больш за 750, — то над гэтым, а таксама над скарачэннем колькасці абавязковых ліцэнзій, праце спецыяльна створаная група на чале з першым намеснікам прэм'ер-міністра Васілём Мацюшэўскім. Ствараецца таксама спецыяльны электронны рэсурс з пакрокавай інструкцыяй, у якія інстанцыі трэба прыйсці, каб аформіць уласную справу. Напрыклад, каб стварыць кафэ, трэба прайсці «квэст» у 25 пунктаў. 30% прадпрымальнікаў спыняюцца на палове шляху, а колькі згублена часу і сродкаў!

Але галоўнае пытанне — складанасці ў планаванні спраў. Шмат здзелак заключаюцца на тры, а то і пяць гадоў наперад, так званыя ф'ючарсныя. Напрыклад, збожжа. Яно прадаецца на біржах, грошы паступаюць вытворцу, ён набывае тэхніку і пасля вырабляе прадукт на заказ. Калі эканамічны стан у краіне зменлівы, мы ўжо не можам так далёка планаваць, асабліва калі гэта датычыцца аптовых закупак.

Сёння не хапае прадпрымальнікаў, здольных ствараць працоўнае месца для сябе і яшчэ хоць бы для аднаго чалавека. Не хапае ва ўсім свеце. Іншыя краіны з задавальненнем прымуць беларускіх прадстаўнікоў бізнесу, але нам жа іх трэба затрымаць тут. Бо ад іх поспехаў залежыць дабрабыт краіны. Бізнесмен павінен адчуваць не страх і рызыку, а падтрымку, тое, што за ім стаіць увесь беларускі народ, які справядліва ацэньвае зробленую ім пякельную працу.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■

**Калектыў Інстытута журналістыкі БДУ выказвае шчыры спачуванні дацэнту Уладзіміру Паўлавічу Субату з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці ЖОНКІ.**

■ Тры пытанні да ўлады

# І СОНЦА З ВЕТРАМ ПРЫНЯСУЦЬ ГРОШЫ



**Летась у Сенненскім раёне прайшлі абласныя «Дажынкі». Райцэнтр значна папрыгажэў. Але рэгіёну патрэбны надзейныя інвестары, новыя прадпрыемствы і стабільная праца тых, што маюцца, актывізацыя недзяржаўнага сектара эканомікі. Як з усім гэтым у раёне? Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з намеснікам старшыні па эканоміцы Сяргеем ГАЛЫНЧЫКАМ.**

***— Як добра канстатаваў на віцебскім бізнес-форуме пасол Германіі, ва ўсім свеце ідзе барацьба за інвестараў. Нават у багатых краінах. Ці ёсць у гэтым пытанні поспехі на раённым узроўні?***

— З 2011 па 2017 год прыцягнулі замежных інвестыцый на суму 322 тысячы долараў. У тым ліку на 172 тысячы — летась. План на бягучы год — каля 100 тысяч долараў.

Галоўны інвестар — фірма «Мілканафорэст». Кампанія перапрацоўвае драўніну (елка, хвоя, лістоўніца). Выпрабляе піламатэрыялы: дошку, брус, палеты... Яны экспартуюцца ў Сербію, Літву, Славенію, Германію, Данію, Польшчу. Заснавальнік — грамадзянін Сербіі.

Даччыная кампанія швейцарска-нямецкага кансорцыума «ТДФ Экатэх АГ», якая прэтэндуе на ролю вядучага вытворцы альтэрнатыўнай энергіі ў СНД, — таксама наш інвестар. У 2018-м дзякуючы ёй пачне функцыянаваць комплекс сонечных батарэй. А праз год — вятрак. Больш за тое, пабудуюць гатэль для запрошаных "тэхнароў" вузкай спецыялізацыі. А тутэйшыя зоймуцца дапаможнымі работамі.

Беларускі інвестар на беразе аднаго з азёр будуе базу адпачынку.

***— А дзяржаўныя прадпрыемствы паспяхова працуюць?***

— Узорным прыкладам можна назваць Багушэўскае прадпрыемства «Прэстыж». Яго спецыялізацыя — вытворчасць швейных вырабаў. У асартыменце: пасцельная і сталовая бялізна, мяшкі і ўпаковачныя пакеты, рабочае адзенне, рукавіцы, галаўныя ўборы, вырабы з дрэва. Стабільную і нядрэнную зарплату атрымлівае каля 90 чалавек.

Яшчэ адна арганізацыя дзяржаўнай формы ўласнасці займаецца закупам малака ў насельніцтва. У яе ёсць абсталяванне для вызначэння якасці малака, аўто... На штодзённую і карпатлівую працу скаргаў не было.

***— Сяргей Аляксандравіч, тэндэнцыя часу: індывідуальных прадпрымальнікаў становіцца менш. Напэўна, і ваш раён не выключэнне?***

— Так. На сёння зарэгістравана 215 індывідуальных прадпрымальнікаў. І больш за 90 займаюцца розднічным гандлем. На жаль. Бо нам хацелася, каб было больш вытворчасці, у тым ліку і па праграме імпартазамяшчэння.

Прыемна, калі індывідуальныя прадпрымальнікі развіваюцца ў кампаніі. У прыватнасці, ёсць фірма, якая займаецца грузаперавозкамі. У 2000 годзе яны ажыццяўляліся на адным аўто. На сёння ў прыватным аўтапарку 12 грузавікоў. У долі экспарту паслуг яны забяспечваюць 49%. Фуры дастаўляюць тавары ў Расію і Літву, Латвію. У перспектыве — Германія, Польшча і Балгарыя.

Мы будзем рады падтрымаць прыватную ініцыятыву. Плюсоў у нашага раёна нямала. Побач — Віцебск. Праз раён пралягае міжнародная траса М1. Ёсць дзве веткі чыгункі: Орша—Віцебск і Орша—Лепель. Патэнцыял рабочай сілы немалеенькі. Насельніцтва працаздольнага — каля 9 тысяч, а ўсяго ў раёне — 22 тысячы. Прывабнасць і ў цудоўнай прыродзе. Толькі азёр у нас каля 70! І пры правільным падыходзе можна добра зарабіць на турызме, прыдарожным сэрвісе...

У райвыканкаме я і мае калегі ахвотна кансультуем пачаткоўцаў і вядзём перамовы з ужо вопытнымі бізнесменамі. Нагадваем пра дзяржаўныя прэферэнцыі для адкрыцця сваёй справы ў глыбінцы. Умовы насамрэч вельмі прывабныя.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ На парадку дня

# Дзейнічаць на апярэджанне

## У сталіцы адбылася канферэнцыя, прысвечаная прафілактыцы правапарушэнняў

**10 сакавіка прайшла нарада ў Прэзідэнта з супрацоўнікамі праваахоўных органаў, падчас якой кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на неабходнасці больш эфектыўнай прафілактыкі правапарушэнняў. А праз тыдзень прадстаўнікі пракуратуры, Міністэрства ўнутраных спраў, адвакацкага корпуса і заканадаўчай улады, Міністэрства інфармацыі, Міністэрства адукацыі, дэпутаты, а таксама мэр горада Мінска і старшыня Мінскага аблвыканкама сабраліся на тэматычнай канферэнцыі, каб падзяліцца вопытам у гэтай сферы.**

**Генеральны пракурор Аляксандр КАНЮК** падкрэсліў, што прафілактыка — гэта складаны перманентны працэс.

— Сёння на першы план выходзіць прафілактыка карупцыйных, эканамічных злачынстваў. Гэта вельмі сур'ёзная тэма, — адзначыў Аляксандр Канюк.

Галоўны пракурор звярнуў увагу на тое, што неабходна аптымізаваць работу ў гэтым кірунку, пераадолеўшы шаблоннасць і фармалізм, у кожным выпадку знаходзіць індывідуальны падыход. Трэба сабраць адпаведны запытам часу кантэнт, які можна будзе прымяняць на лекцыях, да якіх супрацоўнікаў розных службаў неабходна папярэдне рыхтаваць.

— Асаблівую трывогу выклікае распаўсюджванне наркаманіі і п'янства. Колькасць наркаспажыўцоў, якія стаяць на ўліку, складае 14 тысяч чалавек. Летась смяротнасць ад атручвання наркатычнымі сродкамі і псіхатропнымі рэчывамі ўзрасла амаль утрая — з 33 да 95 чалавек. Толькі ў сталіцы ў мінулым годзе ад гэтага памерлі 40 чалавек. Акрамя смяротных зыходаў, ужыванне наркотыкаў прыводзіць да сур'ёзных захворванняў, у тым ліку і да СНІДу, — расказаў Аляксандр Канюк.

Засяродзіць увагу трэба на прымусовым лячэнні ад алкагалізму і наркаманіі з дапамогай тэрапіі, заснаванай на сучасных методыках. У пэўны момант гэтая работа была ўпушчаная. Каля 60—70% злачынстваў з ліку забойстваў, нанясення цяжкіх целесных пашкоджанняў, згвалтаванняў здзяйсняюцца ў стане алкагольнага ап'янення, у многіх выпадках — непрацоўнымі. Вялікая імавернасць, што чалавек, які свядома адмовіўся ад працы, стане на злачынны шлях, таму неабходныя прэвентыўныя меры.

Па словах генеральнага пракурора, установы адукацыі і сацыяльнай сферы павінны стаць цэнтрам прыцягнення як моладзі, так і дарослага насельніцтва: «На бязвыплатных умовах мы абавязаны забяспечыць гарманічнае развіццё новага пакалення, праявіць асаблівы клопат у адносінах да дзяцей з неўладкаваных сем'яў. Яны на бязвыплатнай аснове павінны ўключацца ў спартыўнае і культурнае жыццё».

Што датычыцца прадухілення эканамічных злачынстваў, то ўсе значныя інвестыцыйныя праекты і праекты, звязаныя з буйнымі закупамі, будуць знаходзіцца на пастаянным кантролі пракуратуры, супрацоўнікі якой цяпер засвойваюць сістэму электронных таргоў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НОВЫ АЛГАРЫТМ

**Яго выпрацоўвалі ў Гродне ўдзельнікі рэспубліканскага семінара па пытаннях удасканальвання ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў сістэме адукацыі.**

— Моладзь сёння патрабуе асаблівага падыходу, — падкрэсліў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — Усё мяняецца, прычым моладзь першая ўбірае ў сябе як пазітыўныя рэчы, так і негатыў. Таму наша задача — своечасова прапанаваць ім такі алгарытм жыцця, які дапаможа ўцягнуць іх у палітычны, сацыяльны і эканамічны працэс. Гэта павінна садзейнічаць развіццю нашай краіны як стабільнай і развітой дзяржавы.

Міхаіл Рыжанкоў падкрэсліў, што сёння ёсць прыклады, калі моладзь імкнуцца ўцягнуць у дэструктыўны рух, навязаць негатыўныя звычкі, такія, як распаўсюджванне наркотыкаў, адыход ад здаровага ладу жыцця і вялікую ролю ў папярэджанні гэтага можа сыграць прафілактыка.

— Мы павінны праводзіць яе так, каб было цікава, каб адпавядала маладзёжным «фішкам», — адзначыў Максім Рыжанкоў. — Тут неабходна індывідуальная работа выкладчыкаў, выхавацеляў. Вельмі важна пачуць моладзь, заўважыць іх ініцыятывы, прапанаваць дапамогу.

У рамках семінара яго ўдзельнікі пазнаёміліся з сучаснымі формамі патрыятычнага выхавання моладзі на прыкладзе ўстаноў адукацыі Гродна. Адбылася сустрэча з валанцёрскім атрадам сацыяльна-педагагічнага цэнтра, знаёмства з навучэнцамі Гуманітарнага каледжа ГрДУ імя Янкі Купалы, якія правялі акцыі «Гукі вайны» і «Колер вайны», даведаліся аб вопыце работы ў шосты школьны дзень СШ №38 і прафесійна-тэхнічнага ліцэя будаўнікоў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

## ЧАС СПАКОЮ — У РЫБЫ НЕРАСТ

**З 20 сакавіка ў Беларусі пачне паэтапна ўводзіцца забарона на лоўлю ўсіх відаў рыб.**

Лоўля ўсіх відаў рыбы ва ўгоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей забараняецца з 20 сакавіка па 18 мая, Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай — з 1 красавіка па 30 мая, Віцебскай — з 10 красавіка па 8 чэрвеня. Выключэнне складае аматарскае рыбалоўства адной вудай з адным кручком або адным спінінгам, аснашчаным штучнай прынадай з адным кручком у светлы час сутак з берага або са штучных збудаванняў, акрамя чыгуначных і іншых мастоў, плацін, шлюзаў і іншых гідратэхнічных збудаванняў.

Акрамя названых тэрмінаў забароны на лоўлю рыбы ў рыбалоўных угоддзях дзейнічаюць забароны на лоўлю шчупака — з 1 сакавіка па 15 красавіка, у Віцебскай вобласці — з 9 сакавіка па 25 красавіка; сома звычайнага — з 1 лістапада па 31 сакавіка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПАЯЗДЫ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЛЕТНІ ЧАС

**У сувязі з пераходам на летні час краін Еўрапейскага саюза і Украіны ў ноч з 25 на 26 сакавіка Беларуская чыгунка сумесна з чыгуначнымі адміністрацыямі Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны загадзя праведзена карэкціроўка раскладу руху міжнародных паяздоў.**

Як паведамляе прэс-цэнтр магістралі, напрыклад, поезд №805 Мінск — Вільнюс з 26 сакавіка будзе прыбываць у Вільнюс у 10.30 (час адпраўлення з Мінска застанецца без змяненняў). Поезд №806 Вільнюс — Мінск пасля 26 сакавіка будзе адпраўляцца з Вільнюса ў 19.10. Час прыбыцця ў Мінск застанецца ранейшым.

Змены закранулі і міжнародныя паязды ў зносінах з Украінай і Польшчай. Так, поезд №86 Мінск — Кіеў, які адпраўляўся з нашай сталіцы ў 22.40 і прыбываў у Кіеў у 7.52, з 26 сакавіка будзе адпраўляцца з Мінска ў 22.40 і прыбываць у Кіеў у 8.40. Пасля пераходу на летні час у зваротным напрамку цягнік №85 будзе адпраўляцца з Кіева ў 22.35 (да 26 сакавіка адпраўляўся ў 21.44) і прыбываць у нашу сталіцу ў 8.38.

У сувязі са змяненнямі ў графіку руху міжнародных паяздоў скарэкціраваны і расклад руху асобных паяздоў, якія курсіруюць па тэрыторыі краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПЕРАЛІК ПТУШАК ДЛЯ ЗДАБЫЧЫ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

**Паляванне на глушца і цецерука адкрываецца ў Беларусі з 20 сакавіка.**



Сезон будзе доўжыцца па 10 мая. Самцоў гэтых відаў птушак можна здабываць на такавішчах зброевым спосабам з падыходу і з засады.

Сезон палявання на птушак у Беларусі адкрыўся сёлета 11 сакавіка з дазволу на здабычу гусей і качак. У адпаведнасці з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання гэты сезон палявання можа працягнуцца да 14 мая, але не больш за чатыры тыдні (28 каляндарных дзён).

З 1 красавіка па 14 мая будзе дазволена паляванне на самцоў слонкі «на цязе». Да 31 сакавіка працягнецца паляванне беззброевым спосабам на андатру і амерыканскую норку, а таксама паляванне на бабра і выдру як зброевым, так і беззброевым спосабамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## КЛІМАТЫЧНЫ СЦЭНАРЫЙ МОЖНА СПРАГНАЗАВАЦЬ?

**Цэнтр кліматычных даследаванняў створаны ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Такое рашэнне было прынята на пасяджэнні бюро Прэзідыума НАН.**

Новая структура будзе займацца правядзеннем навуковых даследаванняў па шэрагу важных кірункаў, сярод якіх даследаванне глабальнага і рэгіянальнага клімату і яго змяненняў, навуковае забеспячэнне міжнародных абавязальстваў у галіне кліматалогіі, распрацоўка фізічных асноў для звышдоўгатэрміновых прагнозаў надвор'я і прагнозаў (сцэнарыяў) змянення клімату, уключаючы прагноз экстрэмальных кліматычных з'яў (засух, паводак, суровых і цёплых зім і г.д.).

Адным з галоўных кірункаў работы Цэнтра кліматычных даследаванняў стане ацэнка ўплыву надвор'я на кліматычна залежныя галіны эканомікі і распрацоўка рэкамендацый па іх адаптацыі.

Навуковым кіраўніком Цэнтра кліматычных даследаванняў стаў вядомы кліматолаг, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі, акадэмік Уладзімір Логінаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ПАСТКА ДЛЯ АЎТАМАБІЛІСТАЎ

Яшчэ адзін прыклад таго, што не трэба быць вельмі даверлівым. У Магілёве распачата крымінальная справа ў адносінах да супрацоўнікаў аднаго з сэрвісных аўтацэнтраў. На працягу амаль 2 гадоў яны аказвалі пасрэдніцкія паслугі ў продажы аўтамабіляў, але ў інтэрнэце выдавалі сябе за сапраўдных рэалізатараў гэтых машын і размяшчалі на іх ілжывыя характарыстыкі.

За свае паслугі яны бралі ад 1000 да 2000 новых рублёў, але нават не клапаціліся пра тое, у якім стане знаходзілася машына. Былі выпадкі, калі тавар аказваўся не на ходу або зусім не "растаможаны". Спробы кліентаў разабрацца з пасярэднікам, які падманулі жаданні, заканчваліся нічым. У аўтацэнтры гэтыя скаргі ўпарта ігнаравалі.

— За распаўсюджванне заведама лжывай інфармацыі супрацоўнікі аўтацэнтра абвінавачваюцца па артыкуле 250 частка 1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, — удакладніла **старшы пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Таццяна БУРАКОЎСКАЯ.** — Ім пагражае штраф, або папраўчыя работы на тэрмін да двух гадоў, або арышт да трох месяцаў, ці абмежаванне волі тэрмінам да двух гадоў. А вось пацярпелым, каб атрымаць нейкую кампенсацыю, прыйдзецца самастойна звяртацца ў суд і ў парадку грамадзянскага судаводства адстойваць свае правы. Дарэчы, на сёння ад дзейнасці гэтага аўтацэнтра пацярпелі як мінімум 20 чалавек.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Прыярытэты

# Калі слова даражэйшае за грошы

## ГАЛОЎНЫМ ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЗНАК УВАГІ ТЫХ, ХТО ПОБАЧ

**Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў — адна з найбуйнейшых, вядучых і аўтарытэтных грамадскіх арганізацый краіны — неўзабаве адзначыць сваё 30-годдзе. У яго шэрагах — каля 2,6 мільёна чалавек (амаль чвэрць насельніцтва Беларусі!). З іх крыху больш чым 10 тысяч — ветэраны Вялікай Айчыннай.**



Чым жывуць сёння ўдзельнікі самай жудаснай вайны ў гісторыі чалавецтва, якія праблемы хвалююць ветэранаў нашай краіны, расказаў **старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў генерал-маёр запасу Іван ГАРДЗЕЙЧЫК.**

***— З кожным годам удзельнікаў бітвы пад Масквой, падзей пад Сталінградам і на Курскай дузе, вызвалення Беларусі, іншых краін ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама штурму Берліна становіцца ўсё менш... Колькі гадоў сёння самаму малодшаму з пакалення пераможцаў?***

— На жаль, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны сыходзяць... Сёння самаму маладому ўдзельніку тых падзей — 92 гады. Уявіце сабе гэтых людзей, якія рызыкавалі сваімі жыццямі дзеля таго, каб мы жылі пад мірным небам і ясным сонцам. Актыўных сярод іх — адзінкі.

Але не зусім правільна было б казаць, што ветэранскія шэрагі радзеюць. Аб'яднанне папаўняецца за кошт ветэранаў працы, сілавых структур. Дасягнуўшы пенсійнага ўзросту, яны ўліваюцца ў нашы шэрагі і актыўна прымаюць удзел у жыцці арганізацыі. У першую чаргу, займаюцца выхаваннем падрастаючага пакалення. Сярод нас шмат людзей, з якіх варта браць прыклад: два Героі Савецкага Саюза, Героі Сацыялістычнай Працы, кавалеры ордэна Працоўнай Славы... Людзі, якія сваёй самаадданай працай аднаўлялі гарады і вёскі з попелу і руін, таксама заслужылі, каб да іх ставіліся як да сапраўдных патрыётаў нашай дзяржавы.

***— Іван Аркадзевіч, 30 гадоў таму аб'яднанне было створана ў першую чаргу з мэтай абараніць правы ветэранаў, а калі трэба, то дапамагчы ім і рублём...***

— Асаблівая ўвага ў гэтым плане ўдзяляецца адзінокім людзям. Дапамагаем вырашаць пытанні па іх лячэнні, на зімовы перыяд забяспечваем прытулкам у спецыяльных цэнтрах. Больш за ўсё ўзнікае пытанняў жыццёвых. Увосень, асабліва гэта актуальна для сельскай мясцовасці, прадстаўнікі мясцовай улады кантралююць падрыхтоўку ветэранаў да зімы. Ідуць да іх разам з супрацоўнікамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, якія правяраюць спраўнасць печы, стан праводкі. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам сярод нашых шэрагаў усё менш становіцца пагарэльцаў. Толькі галоўнае для ветэрана — знак увагі. Часам ён звяртаецца да цябе быццам бы з праблемай. Ты з чалавекам пагаварыў, у выніку робіш выснову, што ніякай праблемы і не было. Аказваецца, ветэрану неабходна, каб яго проста нехта выслухаў.

***— Вы шмат ездзіце па краіне і на свае вочы бачыце, як працуюць ветэранскія арганізацыі ў рэгіёнах. Што хвалюе ветэранаў на месцах?***

— Не так даўно быў у Крычаве і скажу, што мацнейшай раённай ветэранскай арганізацыі, напэўна, пакуль няма: кожны чалавек на ўліку, вельмі актыўныя лідары, якія трымаюцца адзін за аднаго. А праблемы ўсюды аднолькавыя. Асабліва ў адзінокіх ветэранаў. Чым можам, тым і дапамагаем. У сельскай мясцовасці гэта адбываецца больш адрасна. Выдатна працуюць валанцёры, не застаюцца ў баку і піянеры, моладзь БРСМ — яны лічаць за гонар дапамагчы ветэранам. Наводзяць парадак у падсобнай гаспадарцы, у садзе, прыбіраюць у хаце, ходзяць па прадукты, калі неабходна, прынясуць вады, дроў... Сёння гэта той клопат, які патрэбны ветэранам. Хоць многім не трэба і гэтага. Паўтаруся, людзям даражэй тое, што чалавек прыйшоў і пагаварыў з імі.

А які гонар удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны адчуваюць, калі на іх хаце з'яўляецца таблічка «Тут жыве ветэран». У вёсцы гэта ўвогуле маштабная падзея! У свой час гэта было ўпушчана. І дарэмна. Калі яшчэ ў сельскай мясцовасці адзін аднаго ведае, то ў гарадах варта і нагадаць некаторым суседзям, што побач з ім жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

***— Помню, як удзельнікі тых падзей расказвалі нам, школьнікам, пра вайну. Дзякуючы сучасным тэхналогіям у падлеткаў стала больш магчымасцяў пазнаёміцца са сваёй гісторыяй...***

**«Часта даводзіцца чуць, што ні ў адной краіне былога Савецкага Саюза няма такога трапяткога стаўлення да ветэранаў Вялікай Айчыннай, як у Беларусі».**

— Сёння трэба больш гаварыць на ўсіх узроўнях пра вайну, любую вайну, якая прынесла шмат гора. Часцей казаць пра салдат Вялікай Айчыннай, якія цаной свайго жыцця перамаглі фашызм. Праўдзівую гісторыю павінны ведаць усе — дзеля таго, каб у нас была светлая будучыня. Ды і ніякі камп'ютар не заменіць жывой гутаркі. Таму пакуль больш-менш дазваляе здароўе, ветэраны сустракаюцца са школьнікамі і студэнтамі. Прычым іх ніхто не прымушае ісці ў школы, універсітэты, працоўныя калектывы. Але яны ідуць і нясуць самыя добрыя зерні дзеля таго, каб наша моладзь убірала, як губка, усё самае лепшае, што звязана з сумленнасцю і прыстойнасцю. Сёння няма такога хлопчыка, які б з зайздрасцю не глядзеў на ветэрана, увешанага ордэнамі і медалямі. А калі ён яшчэ пачынае гаварыць і расказваць аб тых выпрабаваннях, якія перанёс, ніхто не застаецца абыякавым. Ці калі дзеці вайны распавядаюць падлеткам, як яны ў іх узросце хадзілі за канём і сеялі хлеб. Сучасныя дзеці нават уявіць не могуць, што такое можа быць.

***— Як узаемадзейнічаеце з ветэранскімі арганізацыямі іншых краін?***

— У нас падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве з ветэранскімі арганізацыямі Расіі, Украіны і Малдовы. Мы часта абменьваемся з калегамі меркаваннямі, дапамагаем у пошуку загінулых родных, якія пахаваны на беларускай зямлі. Лідары ветэранскага руху Украіны па-добраму зайздросцяць нам. А ў першую чаргу таму, што ў нас мірна і спакойна. Наведваючы пахаванні часоў Вялікай Айчыннай вайны, яны ўражаны тым, у якім стане ў Беларусі знаходзяцца помнікі і магілы. У некаторых нашых суседзяў, наадварот, знішчаюць гістарычную памяць цэлага народа. Асабліва пакутуюць у гэтым плане прыбалтыйскія краіны. Часта даводзіцца чуць, што ні ў адной краіне былога Савецкага Саюза няма такога трапяткога стаўлення да ветэранаў Вялікай Айчыннай, як у Беларусі. Асабіста я нават уявіць не магу, калі сыдзе апошні ўдзельнік тых падзей... Але відавочна, што годнымі прадаўжальнікамі іх слаўных баявых традыцый сёння з'яўляюцца воіны-афганцы. Гэта людзі, якія не па чутках ведаюць, што такое вайна, а таксама мір і спакой у дзяржаве.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Даслоўна

**Валерый ГАЙДУКЕВІЧ:**

# «У Афганістане мы ўпершыню сутыкнуліся з тэрарызмам»

**Яшчэ з савецкага часу было заведзена падводзіць вынікі пяцігадовай працы, будаваць планы на наступную пяцігодку. Працягваючы традыцыі сваіх папярэднікаў, удзельнікі IX з'езда грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», які неўзабаве адбудзецца ў Мінску, раскажуць аб зробленым у мінулым паўдзесяцігоддзі, абмяркуюць надзённыя пытанні і вызначацца з кірункамі далейшай дзейнасці.**

На што будзе акцэнтавана ўвага ўдзельнікаў з'езда, а таксама якія пытанні ўвогуле хвалююць воінаў-інтэрнацыяналістаў, расказаў **старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане генерал-маёр запасу Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.**

— Яшчэ на мінулым з'ездзе мы вызначыліся з дзвюма асноўнымі задачамі, якія незалежна ад часу будуць для нас прыярытэтнымі, — расказвае кіраўнік ветэранскай арганізацыі. — Па-першае, гэта ўдзел ветэранаў вайны ў Афганістане ў патрыятычным выхаванні насельніцтва. Мы разумеем, што ветэраны Вялікай Айчыннай паступова сыходзяць з жыцця, і хто, як не мы, павінен прыняць гэтую эстафету? Другая важная задача — дапамога тым воінам-інтэрнацыяналістам, каму яна патрэбна перш за ўсё. У нас дастатковая колькасць людзей, якія знайшлі сваё месца ў жыцці. Але ёсць і іншыя, каму з розных прычын пашанцавала крыху менш.



Фота Надзеі БУЖАН.

У той жа час Валерый Гайдукевіч добра разумее, што наша краіна — не Савецкі Саюз, які меў дастаткова вялікія рэсурсы, таму дапамагчы ўсім наўрад ці магчыма. «З кожнай праблемай трэба разбірацца адрасна, — лічыць старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. — Напрыклад, сярод нас ёсць інваліды трэцяй групы, якія трапілі ў Афганістан салдатамі тэрміновай службы. Па аб'ектыўных прычынах, працоўнага стажу ў іх няма. У выніку яны атрымліваюць мізэрныя пенсіі».

Ёсць увогуле парадаксальныя сітуацыі. У прыватнасці, вярнуўся чалавек з Афганістана, яму давалі другую групу інваліднасці. Ён адмовіўся, бо на пенсію па інваліднасці пражыць складана, а сям'ю карміць трэба. Далі трэцюю групу, і ён пайшоў працаваць. Цяпер чалавек збіраецца на пенсію, і каб яна была больш-менш прыстойнай, добра было б вярнуць другую групу. Але чамусьці вяртаць адмаўляюцца. Рука ж за гэты час у яго не вырасла...

— Да людзей, якія ваявалі не па сваёй волі, прычым атрымалі баявыя раненні, патрэбна праявіць больш клопату, — перакананы Валерый Уладзіміравіч. — Сёння з сацыяльных гарантый людзям, якія выконвалі баявыя задачы, засталіся толькі прыбаўка да пенсіі і бясплатны праезд у грамадскім транспарце. Па вялікім рахунку, на іншыя рэчы мы і не прэтэндуем. Больш за ўсё нас хвалюе пытанне інвалідаў. Вядома ж, праблемы са здароўем ёсць у многіх афганцаў. Удзел у баявых дзеяннях ніколі не праходзіць бясследна. Забіць чалавека — не так проста. Не кожны можа гэта перажыць псіхалагічна. Людзей, якія праз гэта прайшлі, трэба вяртаць да жыцця. Амерыканцы ў свой час стварылі рэабілітацыйны цэнтр, праз які ўдзельнікі баявых дзеянняў праходзяць разам з сем'ямі. У нас, у Савецкім Саюзе, такога не было. Расія прыйшла да гэтага пасля другой чачэнскай вайны. Але перш шмат хлопцаў спілося: прыехалі дадому і сталі нікому не патрэбныя. Выстаяў той, хто быў больш вынослівым.

Сёння ў грамадскім аб'яднанні налічваецца крыху больш чым 13,5 тысячы чалавек. Усяго ў Беларусі пражывае каля 24 тысяч ветэранаў вайны ў Афганістане. А калі ўлічыць тых, хто выконваў інтэрнацыянальны доўг на тэрыторыі іншых дзяржаў, дык і таго больш. Самаму маладому афганцу сёння — 46 гадоў. Многія ветэраны той вайны пайшлі з жыцця ўжо ў мірны час.

Воіны-інтэрнацыяналісты актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці краіны. У многім дзякуючы ім у большасці раённых цэнтраў стаяць памятныя знакі, прысвечаныя загінулым у Афганістане. У рэгіёнах дзейнічаюць патрыятычныя класы, музейныя пакоі, клубы па інтарэсах. Створана серыя партрэтаў удзельнікаў афганскай вайны: тых, якія, выконваючы інтэрнацыянальны доўг, загінулі, і тых, каму пашчасціла вярнуцца на Радзіму. Сваім баявым вопытам воіны-інтэрнацыяналісты сёння дзеляцца са школьнікамі і курсантамі.

— Вядома, цяпер іншыя формы вядзення вайны, тым не менш падрыхтоўка з улікам мінулых падзей таксама мае права на існаванне, — лічыць старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. — Я не раз добрым словам успамінаў сваіх камандзіраў па разанскім вучылішчы, якія мяне шмат чаму навучылі. Можа, таму і жывы застаўся (Валерый Уладзіміравіч з'яўляецца ўдзельнікам баявых дзеянняў у Афганістане. — **Аўт.**). Ваенная навука няпростая. Чым адрозніваецца кіраўнік у пагонах ад свайго калегі па цывільным жыцці? Апошні прыняў рашэнне, заўтра зразумеў, што памыліўся, у выніку зрабіў некаторыя карэкціроўкі. У баі так не бывае: калі ты памыліўся, то нехта загінуў.

У свой час да падзей у Афганістане было неадназначнае стаўленне. Удзельнікі баявых дзеянняў падвяргаліся крытыцы: маўляў, незразумела, што яны там робяць. «Магчыма, можна было так казаць аб кіраўніках, якія па першым часе прымалі не зусім адэкватныя рашэнні, — гаворыць воін-інтэрнацыяналіст. — Але я, як і многія іншыя, выконваў загад. Мяне паднялі па трывозе і адправілі. Некаторыя думалі, што ў Афганістан едуць адпачыць і чымсьці прыбарахліцца. Цяпер даюцца іншыя ацэнкі тых падзей, кажуць пра тое, што ў Афганістане мы ўпершыню сутыкнуліся з тэрарызмам. Трэба разумець і яшчэ адну важную дэталь: на тым баку ваявалі прафесіяналы, у нас жа — у асноўным салдаты тэрміновай службы. Тым не менш спраўляліся. Цяпер самі афганцы кажуць пра тое, што мы не толькі ваявалі, а і будавалі, аказвалі медыцынскую дапамогу, пастаўлялі харчаванне...»

— З заканчэння вайны ў Афганістане ўжо прайшло больш як 28 гадоў, але свет спакайнейшым не стаў, — адзначае Валерый Гайдукевіч. — Самае жахлівае, што побач з нашымі межамі ідзе вайна (як бы яе не называлі), дзе гінуць і становяцца калекамі маладыя людзі. Таму сёння наша задача — з'яднацца яшчэ больш, каб не пайсці па шляху нашых суседзяў, не паўтарыць трагедый, з якімі ў свой час сутыкнуліся мы і нашы продкі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Дзейныя асобы

# ПРАПУСЦІЦЬ ПРАЗ СЭРЦА...

## Такі прынцып палкоўніка ў адстаўцы Уладзіміра Фалецкага, які больш за 30 гадоў аддаў самаахвярнаму служэнню Айчыне

**Ветэран Узброеных Сіл СССР чвэрць стагоддзя працуе ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Яго называюць «залатым фондам» музея і прымаюць персанальныя заяўкі як на экскурсавода.**



Уладзімір Палікарпавіч прыйшоў у музей ужо ў сталым узросце, але дзякуючы карпатлівай працы за кароткі час асвоіў аб'ёмны матэрыял па гісторыі Вялікай Айчыннай, не саромеўся вучыцца экскурсійнай справе ў маладых, але больш вопытных калег.

Захоплены, творчы чалавек, ён увесь час працуе над сабой. Пры падрыхтоўцы да экскурсій шмат чытае дакументальных матэрыялаў, мемуарнай літаратуры, вывучае ўспаміны ветэранаў, пастаянна карыстаецца дакументамі фондаў музея. Уладзімір Фалецкі валодае рэдкім дарам — умее выклікаць прыхільнасць да сябе ў слухачоў, наведвальнікаў музея, пераканаць іх у гістарычнай праўдзе аб мінулай вайне.

Пасляхова валодаць прафесіяй музейнага работніка яму дапамагае ўвесь яго шматгадовы жыццёвы шлях. Уладзімір Палікарпавіч па праву называе сябе дзіцем вайны: ён нарадзіўся ў маі 1940 года ў вёсцы Рассвет Акцябрскага раёна, што на Гомельшчыне. З пачаткам Вялікай Айчыннай яго сям'я, як і тысячы іншых, спазнала ўсе жахі нямецкай акупацыі. Але ўсё ж самым яркім успамінам дзяцінства для Уладзіміра стаў дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, калі на ўскрайку яго вёскі спыніўся савецкі танк. І хлапчукі, сярод якіх быў і малалетні Валодзя, навыперадкі беглі да баявой машыны, зачаравана глядзелі на яе, узбіраліся на браню, прымяралі танкавыя шлемафоны. Стаць танкістам з тых часоў стала запаветнай марай Уладзіміра.

У 1960 годзе ён быў прызваны служыць у гвардзейскую вучэбную танкавую дывізію, што ў Печах. Меначата франтавік Браніслаў Карпенка (цяпер ён узначальвае ветэранскую арганізацыю Ленінскага раёна сталіцы) даў сельскаму хлопцу сапраўдную пуцёўку ў вайсковае жыццё, падтрымаў імкненне юнака стаць афіцэрам. Уладзімір Фалецкі скончыў курсы па падрыхтоўцы камандзіраў узводаў, экстэрнам здаў экзамены ва Ульянаўскім танкавым вучылішчы. Ініцыятыўны і старанны афіцэр шмат гадоў паспяхова служыў на розных камандна-палітычных пасадах, аб чым сведчыць ордэн «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» 3-й ступені.

Незабыўная старонка ў біяграфіі Уладзіміра Фалецкага — два гады, праведзеныя ў Афганістане. Будучы намеснікам палітаддзела 5-й гвардзейскай мотастралковай дывізіі, ён не раз удзельнічаў у аперацыях супраць душманаў, асабістым прыкладам натхняў воінаў-гвардзейцаў на паспяховае выкананне баявых задач. За праяўленыя мужнасць і адвагу афіцэр узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Па вяртанні на Радзіму служыў на адказнай пасадзе ў Гомельскім аблваенкамаце. Тут глыбокія і незагойныя раны ў яго лёсе пакінуў Чарнобыль. З першых дзён страшнай бяды, якая нечакана прыйшла ў нашу краіну, ён разам з іншымі ўдзельнічаў у шырокамаштабных ліквідацыйных работах на тэрыторыі вобласці.

Унукі Уладзіміра Палікарпавіча па прыкладзе дзеда сваё жыццё прысвяцілі служэнню Айчыне. Старэйшы скончыў Мінскае суворАўскае ваеннае вучылішча і ваенны факультэт БДУ, цяпер ён маёр, намеснік камандзіра батальёна. Другі ўнук — капітан, пасля заканчэння Ваеннай акадэміі праходзіць службу ў пагранічных войсках.

У штомесячным часопісе Міністэрства абароны СССР «Военный вестник» у свой час тады яшчэ гвардыі падпалкоўніку была прысвечана публікацыя. У артыкуле ёсць радкі, якія ярка характарызуюць афіцэра: «Кола заняткаў падпалкоўніка Фалецкага такое шырокае, што цыркулем дваццаці чатырох гадзін акрэсліць яго немагчыма. Ён вырашае службовыя справы ў штабе і ў полі, да яго прыходзяць людзі дадому ў любы час сутак, а нярэдка ён сам выязджае за многія кіламетры ад гарнізона, каб разабрацца ў чымсьці лёсе. Праблемы і задачы навальваюцца на яго з усіх бакоў. І ўсё трэба зразумець, прапусціць праз сэрца, ні ад чаго нельга адмахнуцца...»

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
**член Беларускага саюза журналістаў**

■ Ракурс

# УНІКАЛЬНАЕ МЕСЦА

## У Дзяржаўным музеі ваеннай гісторыі Беларусі экспануецца выстава, якая расказвае пра Скобелеўскі лагер

**Пачынаючы з канца XIX стагоддзя, невялікае поле пад Баранавічамі становіцца эпіцэнтрам баявой падрыхтоўкі. На манеўры ў Скобелеўскі лагер, названы ў гонар «белага генерала», прыбываюць вайскоўцы Рускай імператарскай арміі. У асноўным — ураджэнцы Беларусі.**



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

